Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №1(76), 2013

УДК 811.161.3:398.95:27-186

Семантычныя мадэлі і асноўныя матывы беларускіх фразеалагізмаў пра смерць

В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава

У артыкуле вызначаюцца семантычныя мадэлі ўтварэння і асноўныя матывы фразеалагізмаў беларускай мовы, аб'яднаных агульным значэннем 'смерць' як асновы ўяўленняў і асэнсавання смерці ў часе і прасторы культуры народа.
Ключавыя словы: фрагмент карціны свету, фразеалагізм, семантычная мадэль, матыў, культурна-нацыянальная інфармацыя.

The article determines the main motives and semantic models of formation of phraseological units of the Belarusian language united by the common meaning of "death", analyzing them as the basis of perception and understanding of death in terms of time and space in Belarusian culture.
Keywords: world view fragment, phraseological unit, semantic model, motive, cultural and national information.

Кожная мова рэалізуе пэўны спосаб адлюстравання рэчаіснасці ў адпаведнасці з канкрэтна гістарычным вопытам народа, яго культурай, умовамі яго жыцця. Яшчэ каля двух стагоддзяў назад В. фон Гумбальд сцвярджаў: "Розныя мовы – гэта не розныя абазначэнні аднаго і таго ж прадмета, а рознае бачанне яго..." [1, с. 9]. Кожная мова валодае мноствам сродкаў і спосабаў абазначаць прадметы, з'явы, паняцці і перадаваць іх змест, з якіх найбольш "культураноснымі" лічацца фразеалагічныя адзінкі (ФА), што абумоўлена іх спецыфікай валодаць знакавай прыродай і здольнасцю ў згорнутым выглядзе ўтрымліваць вялікі аб'ём інфармацыі, фіксаваць, захоўваць і перадаваць ад пакалення да пакалення вопыт узаемадзеяння чалавека з акаляючым асяроддзем. Гэтыя адметныя адзінкі мовы нясуць у сабе закадзіраваную інфармацыю пра нацыянальна-культурны светапогляд народа, яго ўнікальныя духоўныя і культурныя адметнасці. Аднак менавіта гэта асаблівасць ФА (да ФА ў межах артыкула аднесены толькі тыя, што вызначаюцца найперш цэласнасцю значэння пры раздзельным афармленні мінімум двух кампанентаў, якое не роўнае суме значэнняў кампанентаў і не выводзіцца з іх, ці разуменне аб'ёму фразеалогіі ў вузкім значэнні) дае магчымасць рэканструяваць нацыянальны вобраз свету, часткова адлюстраваны ў іх.

Якраз неабходнасцю поўнага і сістэмнага даследавання моўнай карціны свету, пад якой разумеецца сукупнасць ведаў пра свет, адлюстраваных у мове, а таксама вызначэння спосабаў атрымання і інтэрпрэтацыі ведаў, паколькі мова разглядаецца як пэўная канцэптуальная сістэма і як сродак афармлення ведаў пра свет, абумоўлена актуальнасць вывучэння ФА, што рэпрэзентуюць адзін з важнейшых фрагментаў карціны свету беларусаў – асэнсаванне паняцця 'смерць'. А поўнае і сістэмнае даследаванне моўнай карціны свету магчыма шляхам паступовага і паслядоўнага вывучэння фрагментаў гэтай карціны.

Цікавасць да тэмы смерці выклікана неабсяжнасцю, глыбінёй і яе ўніверсальнасцю, а вывучэнне прыроды смерці, заключанай ва ўнутранай форме ключавых яе вызначэнняў, дапамагае адказаць не толькі на пытанне пра канец, завяршэнне, але і пра пачатак.

Тое, што смерць – адно з важных паняццяў у жыцці беларусаў, адзін з істотных фрагментаў карціны свету, сведчаць колькасныя дадзеныя: толькі ў складзе аднаго слоўніка фразеалагічных багаццяў беларускай літаратурнай мовы зафіксавана амаль 300 ФА [2], якія выяўлены метадам суцэльнай выбаркі на аснове наяўнасці ў слоўнікавых дэфініцыях семы 'смерць'. І яшчэ адным сведчаннем актуальнасці служыць той факт, што ў кожнай мове ФА называюць, у адрозненне ад лексічных адзінак, не ўсе, а толькі асобныя і найбольш актуальныя для чалавека і яго жыццядзейнасці фрагменты свету.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Зварот да ФА са значэннем ‘смерць’ абумоўлены і тым, што гэтае пытанне не было прадметам даследавання, а ФА, што рэпрэзентуюць паняцце смерць, не былі аб’ектам вывучэння ў беларускім мовазнаўстве. Хаця лексіка-фразеалагічны склад семантычнага поля ‘смерць’, нярэдка ў супастаўленні ‘жыццё – смерць’, у розны час быў аб’ектам увагі многіх рускіх, украінскіх даследчыкаў, у тым ліку А.Б. Юмінавай (1999), С.М. Талстой (1999), В.Ю. Апрэсяна (2002), В. Ужчанкі (1994, 2003), І.Б. Івановай (2008), О.В. Батарчук (2009) і інш.

Усе спосабы надыходу смерці, паводле вобразаў і семантыкі ФА, можна падзяліць на дзве супрацьлеглыя групы: 1) смерць як заканамерны працэс, натуральная з’ява і 2) смерць як вынік уздзеяння сілы звонку.

1. Аналіз выяўленых ФА першай групы дазваляе адзначыць, што найбольш пашыраным у мінулым з’яўляецца ўяўленне беларусаў пра смерць не як поўнае знікненне, канец, а як змену формы існавання душы чалавека. У сувязі з гэтым набываюць актуальнасць ФА для абазначвання замагільнага жыцця (*той свет* ‘замагільны свет як супрацьпастаўленне зямному жыццю’ і *царства нябеснае* ‘рай, замагільнае жыццё’) і нябожчыка (*без душы* ‘мёртвы’ і *без духу* ‘мёртвы’) для перадачы інфармацыі аб існаванні іншага свету ці ўсведамленне пра мёртвага чалавека, якое звязваецца з адсутнасцю важнейшага крытэрыя жыццядзейнасці чалавека – наяўнасці душы. Выкарыстанне кампанентаў *душа* і *дух* з’яўляецца сведчаннем народных ўяўленняў аб тым, што, з аднаго боку, дух – гэта субстанцыя душы, яе матэрыяльнае ўвасабленне. З другога боку, у адным і тым жа кантэксце, паводле заўвагі С.М. Талстой, «сустракаюцца адгалоскі хрысціянскай канцэпцыі душы, канцэпцыі, якая зыходзіць не з бінарнай апазіцыі цела – душа, а з трыяды цела – душа – дух» [3, с. 231]. І тут адразу выяўляюцца першыя матывы – таго свету, нябожчыка і семантычныя мадэлі метафарычнага прадстаўлення аб смерці – ‘смерць – жыццё ў іншым свеце’ і ‘смерць – адсутнасць душы / духу’.

Пры гэтым большасць ФА характарызуюцца амаль скразным матывам падарожжа, дзякуючы выкарыстанню дзеясловаў руху, перамяшчэння (*адпраўляцца на той свет, адыходзіць з гэтага свету, адыходзіць у іншы свет, адыходзіць у лепшы свет, адыходзіць на той свет, адыходзіць у вечнасць*) ці аддзеяслоўных назоўнікаў (*адыход / зыход у іншы свет* і *адыход у лепшы свет*) як кампанентаў з няпоўнай стратай значэння. У адзначаных ФА такім чынам канстатуецца ўяўленне аб пераходзе чалавека з адной сутнасці (жыцця на гэтым свеце) да другой (працяг жыцця на тым свеце, пры гэтым вечнага жыцця) і выяўляецца семантычная мадэль ‘смерць – падарожжа ў іншы свет’.

Тэма падарожжа вядзе да выяўлення новых матываў ФА і іх семантычных мадэляў. Гэта найперш матывы зямлі, магілы, труны, якія нярэдка вар’іруюцца.

Так, выдзяляецца семантычная мадэль ‘смерць – падарожжа ў зямлю’ (*пайсці / сысці ў магілу / зямлю* ‘памерці’), дзе толькі канечны пункт дарогі, назначэння іншы, адметны ад *таго свету* як замагільнага жыцця ў раі. Тут уяўленне аб смерці перадаецца праз дарогу з паверхні зямлі ў яе глыбіні ці назад у зямлю. ФА захоўвае ўяўленне пра дарогу пакойніка да магілы ці зямлі, з якой чалавек звязвае не толькі рытуал пра пахаванне памерлага, але і пра зямлю як зямельку-маці, якая ўсё дае чалавеку пры яго жыцці на зямлі і забірае яго пасля смерці, калі цела як матэрыяльную сутнасць хаваюць у зямлю ці ў магілу / труну / дамавіну. Узгадаем тут і ФА *аддаць зямлі* ‘пахаваць’, у якой прамое і пераноснае значэнні словазлучэння накладваюцца адно на другое.

Яшчэ дзве мадэлі – ‘быць мёртвым – ляжаць у зямлі’ (*ляжаць у <сырой> зямлі / зямельцы / пяску* ‘быць мёртвым; быць пахаваным’) і ‘быць мёртвым – парыць косці / у зямлі’ (*парыць зямлю / зямельку* і *парыць у зямлі / зямельцы косці* ‘быць мёртвым, пахаваным’, *парыць косці* ‘быць мёртвым, быць пахаваным дзе-н.’), дзе засведчаны адносіны беларуса да зямлі. Асабліва выразна гэта ілюструецца з дапамогай памяншальна-ласкальнага назоўніка *зямелька* як асабліва выразнага кампанента, а яшчэ праз канцэптуальную метафару «паміраць – парыць косці», якая выражае асацыятыўнае ўспрыманне канца жыцця з прыемным дзеяннем (словаспалучэнне *зямлю парыць*, дзякуючы дзеяслову, узгадвае пра прыемны занятак і спакой, адпачынак). Названыя ФА як другасныя намінацыі адлюстравалі такім чынам вобразнасць, этычнасць формы ўпрымання, змястоўна канстатавалі факт надыходу смерці і выразілі філасофію беларусаў смерці – мудрае ўспрыманне канца жыцця на зямлі і вяр-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

танне ў лона сваё (*ляжаць у <сырой> зямлі / зямельцы / пяску; лажыцца ў магілу / труну / дамавіну / зямельку* ‘паміраць’). Наогул у ФА з кампанентам *зямля* выразна выяўляецца архетып зямлі, які цесна звязаны з культам продкаў: “З аднаго боку, продкі лічыліся валадарамі зямлі, з другога, яна была іх вечнай калыскай: “Зямля святая, яна наша маці, яна нас жывых корміць, а па смерці да сябе прыхіляе” [4, с. 145].

Матыў дарогі абыгрываецца і ў жартоўным выразе беларуска-польскай ФА *адпраўляцца / ісці / ехаць да Абрама / Абрагама на піва* ‘паміраць’ ці як вынік дарогі – *трапіць да Абрагама / Абрама на піва* ‘памерці’, дзе зноў выразна выяўляецца семантычная мадэль ‘смерць – падарожжа’.

Пра матыў дарогі сведчыць і ФА *сыходзіць / сходзіць са сцэны* ‘пераставаць існаваць, паміраць’, якая склалася “ў выніку паўторнай метафарызацыі зыходнага словазлучэння, што распаўсюджана ў акцёрскім асяроддзі, і лічыцца калькай з англійскай мовы (quit the stage)” [5, с. 360]. У ёй своеасабліва спалучана адно з уяўленняў пра смерць, якое працягвае тэму дарогі (кампанент-дзеяслоў руху *сыходзіць*) з улікам новых рэалій жыцця (кампанент-назоўнік *сцэна*) і ўказання не “пункта назначэння”, а, наадварот, “пункта адпраўлення”, дзе сцэна ў метафарычным асэнсаванні выступае арэнай жыцця чалавека.

Матыў душы – яшчэ адзін адметны матыў ФА беларускай мовы, на аснове аналізу якіх можна выдзеліць некалькі семантычных мадэляў іх утварэння. Так, паводле вобраза ФА, іх семантыкі, выдзяляюцца мадэлі ‘памерці – аддаць душу / дух’ (*аддаць духі* ‘памерці’; *аддаваць Богу душу* ‘паміраць’), ‘памерці – выпусціць дух’ (*дух выпусціць* ‘памерці’; *дух спускаць* ‘паміраць’; *душа вон* ‘хто-н. адразу, раптоўна памёр’; *дух выйшаў / вылецеў / выскачыў* ‘хто-н. памёр (часцей раптоўна, імгненна)’). У гэтых ФА, іх мадэлях утварэння захавана ўласцівае хрысціянскай культуры ўяўленне пра смерць чалавека ў мінулым і выражэнне разумення смерці як аддзяленне душы ад цела, дзе душа – вышэйшая інстанцыя, тое вечнае, што застаецца пасля смерці, а цела – фізічнае, матэрыяльнае, што знікае. Пры гэтым аддзяленне душы ад цела можа быць дзеяннем таго, хто памірае (*аддаць духі, аддаваць Богу душу, душа вон*), самога духа (*дух выйшаў / вылецеў / выскачыў*), а можа быць і дзеяннем «трэцяй» асобы (*Бог прыбраў*). ФА *аддаваць Богу душу* паходзіць ад «слоў памінальнай малітвы, звернутай да Бога: «Прими душу раба Твоего» [6, с. 59]. У паасобных ФА замест кампанента *душа* выкарыстоўваецца *дух*, што звязана з адлюстраваннем абавязковасці адной працэдуры: памерлы абавязкова павінен выпусціць дух, што вельмі важна (*дух вон, дух выпусціць, дух спускаць*), бо можна і не заўважыць гэта пры раптоўнай смерці (*духу не ўказаць* ‘тут жа, адразу памерці’).

Матыў душы адлюстраваны ў ФА *загавець душой* ‘памерці’, утворанай паводле семантычнай мадэлі ‘памерці – пост душы’. Унутраная форма ФА выяўляе пераасэнсаванне значэння дзеяслова *загавець*, які, паводле лексікаграфічнага тлумачэння, мае значэнне ‘пачаць гавець’ [7, с. 294] і з’яўляецца вытворным ад *гавець* са значэннем ‘у веруючых – пасціць і хадзіць у царкву, рыхтуючыся да споведзі’ [8, с. 8]. У выніку метафарычнага пераасэнсавання дзеяслоўнага словазлучэння ўзнікае ўстойлівы выраз для наймення і характарыстыкі яшчэ аднаго спосабу адыходу ў вечнасць, калі душа «посціць», адыходзячы ад цела.

Сярод ФА са значэннем ‘смерць’ адзначаюцца тыя, узнікненне якіх матывавана абрадавай практыкай падрыхтоўкі нябожчыка ў апошнюю дарогу, захаванне і памінанне яго. Ці зноў прадаўжаецца матыў дарогі і далучаецца матыў адпачынку. Значэнне ‘памерці’ асацыіруецца з вобразам складзеных рук, якія сімвалізуць спакой, адсутнасць работы ў пакойніка (*згарнуць рукі* і *складваць / складаць рукі* ‘памерці’), выцягнутых ног пры гарызантальным палажэнні (*выпроставаць ногі, задзіраць ногі, задзіраць капыты* ‘паміраць’ і *выцягнуць ногі* ‘памерці’), цела, пакладзенага ў труну як апошні дом (*лажыцца ў магілу / труну / дамавіну / зямельку* ‘паміраць’). Як вынік вобразанага мыслення і асэнсавання смерці выяўляюцца такія семантычныя мадэлі ўтварэння ФА, як ‘памерці – скласці рукі’, ‘памерці – выцягнуць ногі’, ‘памерці – легчы’. Звернем увагу на рад *магіла / труна / дамавіна / зямелька* як варыянтных кампанентаў ФА, з якога выдзелім адзін – *дамавіна*, што найбольш дакладна перадае семантыку ўсяго рада, бо, паводле народных уяўленняў, дамавіна – “жытло нябожчыка на “тым

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

свеце”, што адлюстравана ў самой семантыцы слова; у больш шырокім сэнсе – адзін з сімвалаў смерці” [4, с. 132].

Адметную семантычную мадэль ‘памерці’ – ‘памерці – пазбавіцца чаго-н.’ ілюструюць ФА *адкідаць / адкідваць канькі, адкідваць капыты, адкідваць хвост*, да якіх далучаецца ФА *з капылоў <далоў>* з агульным для ўсіх значэннем. Праўда, у адрозненне ад нейтральнай ацэнкі амаль усіх пералічаных вышэй ФА, акрамя толькі некалькіх жартоўных, гэтыя ФА нясуць адмоўную канатацыю. У ФА перададзены грубасць і нетактоўныя адносіны ў выражэнні да таго, хто памёр, што дасягаецца дзякуючы ўжыванню кампанентаў-лексем *канькі, капылы* замест ногі, а таксама *капыты* і *хвост*, як частак, што належаць жывёле і асацыіруюцца з негатывам. ФА *адкідваць капыты, адкідваць хвост, задзіраць капыты* – вынік пераносу прыкметы знешняга выгляду мёртвай скаціны ці з жывёльнага свету на чалавека. Дарэчы, гэтыя ж ФА ўжываюцца яшчэ і са значэннем ‘здыхаць (пра скаціну)’. Дзеяслоўныя фразеалагічныя словазлучэнні пры іх прамым прачытанні даводзяць аб смерці як разуменні яе праз непатрэбнасць чалавеку ног-апоры (ФА з дзеясловам *адкідаць*, дзякуючы якому рэалізуецца сема ‘адмаўляцца, быць непатрэбным’) ці аб іх перамяшчэнні ў процілеглы бок (ФА з дзеясловам *задзіраць*, дзякуючы значэнню якога ‘падняць угору’ рэалізуецца сема ‘ляжаць, падняўшы капыты-ногі ўверх’).

Яшчэ адно ўяўленне пра канец зямнога жыцця чалавека асацыіруецца з нерухомасцю, сном, які ў сферы народнай духоўнай культуры асэнсоўваецца як своеасаблівая разнавіднасць формы смерці. Аналіз унутранай формы і семантыкі ФА *заснуць вечным сном* і *заснуць навекі* ‘памерці’, *спаць вечным сном* і *спаць у сырой зямлі* ‘быць мёртвым, пахаваным’ выяўляюць і новыя семантычныя мадэлі – ‘памерці – заснуць’ ці ‘смерць – сон’. Ва ўсіх ФА паняцце памерці абазначана дзеясловамі *заснуць* і *спаць*, адпаведна чаму паняцце смерць замяняецца назоўнікам *сон*, тым самым выяўляючы іх сінанімічныя сувязі: памерці – заснуць / спаць і смерць – сон. У ФА *спаць у сырой зямлі* ўказваецца яшчэ і месца, дзе хаваюць чалавека, які спіць-памёр, – *сырая зямля*. Акрамя таго, у дзвюх ФА назіраецца актуалізацыя аднакаранёвых слоў – *заснуць – сном* і *спаць – сном*, што яшчэ больш узмацняе, акцэнтуе ўвагу на тым разуменні, што смерць – гэта перш за ўсё сон, а памерці ці быць мёртвым – *заснуць вечным сном, спаць вечным сном.* Такая сувязь з’яўляецца асновай успрымання нашымі продкамі пакойніка (звернем увагу на ўнутраную форму лексемы *пакой-нік*, якая таксама скіроўвае да паняцця ‘пакой’, які асацыяваўся ў жыцці са сном) як чалавека, які заснуў вечным сном, вызваліўся ад жыццёвых клопатаў. Выкарыстанне метафар «смерць – сон», «памерці – заснуць», канатацыйны аспект іх семантыкі дазваляе выявіць яшчэ адно ўяўленне аб смерці – мудрыя і спакойныя адносіны беларуса да смерці, яе ўспрымання як непазбежнага канца клопатнага жыцця жывых на зямлі. Разам з тым такая намінацыя заканчэння жыцця як «заснуць», «спаць» захоўвае семантычную двухпланавасць, вобразнасць і эстэтычнаць успрымання.

Новы вобраз і адметнае ўяўленне пра смерць, спосаб яе катэгарызацыі перададзены ў ФА *аддаваць канцы* ‘паміраць’, якая, як можна меркаваць, значна пазнейшая паводле часу свайго ўзнікнення, паколькі тут смерць разумеецца адметна ад перададзеных уяўленняў ва ўсіх аналізаваных вышэй ФА з зафіксаванымі ў іх паняццямі і асэнсаваннем пра смерць як спадчыны рэлігійна-міфалагічнай культуры. У ФА рэалізуецца разуменне чалавека аб смерці як аб канцы ўсяго, завяршэнні жыцця без яго працягу ў замагільным свеце. Такое ўяўленне прыйшло на змену папярэднім (дарога ў іншы свет, пераход да вечнага жыцця, аддзяленне душы ад цела, злучэнне з зямлёй, дарога да Бога, у рай, наступленне вечнага сну) і было выпрацавана з прыходам антырэлігійнай культуры і стала найбольш характэрным для савецкага часу і ў пэўнай ступені як працяг пасля яго. Магчыма, гэты факт можа растлумачыць і адзінкавасць фразеалагічнай рэпрэзентацыі: смерць разглядаецца як канец, а таму няма пра што і гаварыць.

2. Другая група ФА, што аб’яднаны агульным для ўсіх значэннем ‘перастаць жыць, гінуць у выніку ўздзеяння каго- ці чаго-небудзь на чалавека ў пэўных умовах’, характарызуецца разнастайнасцю матываў (у тым ліку і раней адзначаных) і асабліва семантычных мадэляў свайго ўтварэння.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так, знаёмы ўжо матыў магілы перадаецца ў новай метафарычнай мадэлі – ‘памерці – знайсці магілу’ (*знайсці сабе магілу* ‘загінуць, быць забітым’); матывы магілы / труны / зямлі, таго ці гэтага свету, дарогі – у мадэлі ‘загінуць – насільна перамяшчаць на той свет’ (*заганяць на той свет* ‘даводзіць да смерці’, *гнаць / заганяць / уганяць у магілу / труну / зямлю* ‘даводзіць да смерці’, *зводзіць у магілу / дамавіну* ‘даводзіць да смерці, гібелі каго-н.’, *адпраўляць / пасылаць на той свет* ‘забіваць, знішчаць, даводзіць да смерці’, *пускаць на той свет* ‘забіваць, знішчаць, расстрэльваць’, *пускаць у царства нябеснае* ‘забіваць, знішчаць’) ці ‘загінуць – насільна выправіць з гэтага свету’ (*зводзіць са свету* ‘даводзіць да смерці, гібелі; знішчаць каго-н.’, *зжываць са свету* ‘ствараючы невыносныя ўмовы, даводзіць каго-н. да смерці; губіць, знішчыць’), а матыў душы, духу – у мадэлі ‘пазбавіць жыцця – ‘насільна забіраць душу / дух’ (*вымаць / даставаць душу / духі* ‘даводзіць да смерці, знішчаць каго-н.’, *вытрасці душу* ‘знішчыць, забіць каго-н.’). Як відаць, тут асаблівую ролю выконваюць дзеяслоўныя кампаненты (*адпраўляць, гнаць, заганяць, зводзіць, зжываць, пасылаць, уганяць* і інш.), якія называюць спосаб знішчэння, пазбаўлення жыцця адным другога і надаюць адмоўную канатацыю ўсёй адзінцы. А кампаненты, што называюць самае важнае, галоўнае, сутнасць чалавека (*душа дух*) ці ўказваюць месца, дзе такім чынам забітыя апынуцца пасля гэтага (*той свет, царства нябеснае, магіла / труна / зямля*), перадаюць устойлівую і замацаваную за імі станоўчую ацэнку. У выніку можна гаварыць аб супрацьлегласці ці сумяшчэнні больш ранніх уяўленняў аб смерці як пэўнай заканамернасці, з аднаго боку, з новымі ўмовамі ці прычынамі яе надыходу ў выніку розных знешніх прычын, з другога боку.

Адным з найбольш пашыраных матываў ФА выступае матыў чалавека праз метанімічна-метафарычнае прадстаўленне чалавека праз пэўны орган ці страты альбо пэўнага віду ўздзеяння на яго, які рэалізуецца ў мностве мадэляў вобразнага прадстаўлення, дзякуючы чаму выяўляецца тая ці іншая канатацыя.

Так, семантычная мадэль ‘гінуць – ліць, праліваць кроў’ выкарыстоўваецца ў таксоне *добра – дрэнна* ў залежнасці ад эмпатыі таго, хто гаворыць (*кроў льецца / ліецца / лілася / пральецца*; *ліць / праліваць кроў*; *заліць крывёю, ліць / праліваць кроў*), дзе кроў для носьбіта беларускага нацыянальнага вобраза свету прадстаўляецца як жыццёвая сіла, а таму заліць, ліць, праліць кроў – пазбавіць чалавека жыццёвай сілы.

Выразна дадатная ацэнка спачування характэрна ФА паводле семантычнай мадэлі ‘загінуць – пакласці косці / галаву’ (*злажыць свае косці*; *класці / складаць галаву / галовы; легчы касцьмі / касцямі*) ці ў мадэлі ‘смерць – спыненне работы сэрца’ (*перастала / перастане біцца сэрца*), дзе выяўляецца асэнсаванне чалавекам смерці на аснове самапазнання ці, як у апошняй, – спынення работы асноўнага органа кровазвароту – сэрца.

І наадварот, яўна негатыўную канатацыю нясуць ФА, утвораныя паводле мадэлі ‘загінуць – зрабіць што-н. з пэўнай часткай цела, органам чалавека’ (*звярнуць <сабе> галаву / шыю*; *зламаць сабе галаву / шыю*; *скруціць <сабе> галаву / шыю*; *скруціць / зламаць <сабе> вязы*; *накладаць галавой*; *загрымець касцямі*; *навярнуць галавой*). У пералічаных ФА выяўляецца найбольш стэрэатыпнае ўяўленне аб канцы існавання чалавека на аснове перадачы метанімічнага пераносу часткі (галавы ці шыі альбо касцей) на цэлае (жыццё чалавека). А ў залежнасці ад умоў канчыны ФА даюць адпаведную ацэнку, што выяўляецца на ўзроўні найперш выбару ў кожным выпадку дзеяслоўных кампанентаў.

Матыў уздзеяння на пэўны орган рэалізуецца з дапамогай семантычных мадэляў ‘пазбавіць жыцця – пазбавіць часткі цела ці органа чалавека’ (*адарваць галаву, адкруціць галаву, звярнуць галаву, знімаць / здымаць галаву, паскручваць галовы, скручваць шыю / галаву*; *вымотваць кішкі, выпусціць кішкі, вымотваць жылы*) і ‘пазбавіць жыцця – выкарыстаць рукі’ (*накладваць рукі*).

Разнавіднасцю насільнага завяршэння жыцця чалавекам з’яўляецца расстрэл, што знайшло адлюстраванне ў нешматлікіх, але надзвычай вобразных, выразных і культурназначных адзінках. У іх рэалізуецца матыў дарогі-прымусу (*адпраўляць у штаб Духоніна, адпраўляць у Магілёўскую губерню*), вызвалення дарогі (*прыбіраць з дарогі*) ці насільнага перамяшчэння ў рай (*пускаць да бога*), выдатку на аснове пісьмовага рахунка (*выводзіць / пускаць*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

/ спісваць у расход) ці выбару месца (*ставіць да сценкі / сцяны*). Кожная з адзначаных ФА характарызуецца сваім вобразам, сваёй мадэллю ўтварэння.

У складзе семантычнай мікрагрупы ‘перастаць жыць у выніку забойства’ выдзяляюцца ФА, у аснове якіх метафарычна вобразна адлюстраваны матывы яды – семантычная мадэль ‘загубіць, замучыць – з’есці’ (*жыўцом з’есці / праглынуць; з’есці з трыбухамі / вантробамі*), пажару – мадэль ‘загубіць, замучыць – спаліць’ (*пускаць свечкай да бога; пускаць з дымам да бога*), дзе апошняя ФА выяўляе апеляцыю да вобраза Бога і вызначаецца сваёй адметнасцю, асабліва ў параўнанні з астатнімі ФА, бо ў ёй назіраецца супрацьлегласць паміж насільным спосабам смерці і канатацыйным значэннем, выражэннем спачування, шкадавання таго, хто загінуў, з прычыны такой яго смерці ад каго-небудзь другога.

Такім чынам, ФА, што аб’яднаны агульным значэннем ‘смерць’, перадаюць ад пакалення да пакалення разнастайнасць ўяўленняў пра смерць, якія выяўляюцца праз шматлікія матывы і разнастайныя семантычныя мадэлі. У ФА беларускай мовы зафіксаваны і захоўваюцца найперш хрысціянска-рэлігійныя ўяўленні пра смерць (пераход у іншы свет, адыход душы ад цела, злучэнне цела з зямлёй, сон), адлюстроўваюцца яе прыкметы на аснове знешніх, назіральных сімптомаў ці характэрных рыс пахавальнага рытуалу (складзеныя рукі, выцягнутыя ногі і інш.). Але не менш шырока фразеалогія канстатуе разнастайнасць спосабаў знішчэння адным чалавекам другога як парушэнне хрысціянскай запаведзі не забі (заганяць на той свет, ліць кроў, адрываць галаву, прыбіраць з дарогі і інш.). Выяўленне і аналіз фразеалагізмаў з агульным значэннем ‘смерць’ дазваляе ўявіць, як мяняецца ўяўленне пра смерць у часе, і разам з тым зрабіць высновы аб значнасці захавання мінулых уяўленняў пра смерць для асэнсавання значнасці жыцця чалавека і арганізацыі жыцця кожнага чалавека ці таго пачатку, які папярэднічае смерці.

Літаратура

1. Рамишвили, Г.В. Вильгельм фон Гумбольдт – основоположник теоретического языкознания // Вильгельм фон Гумбольдт. Избранные труды по языкознанию / Под ред. Г.В. Рамишвили. – М. : Прогресс, 1984. – С. 5–33.

2. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў : У 2 т. Т. 1. А–Л / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 672; т. 2. М–Я / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 704 с.

3. Толстая, С.М. Славянские народные представления о смерти в зеркале фразеологии / С.М. Толстая // Фразеология в контексте культуры. – М. : Языки русской культуры, 1999. – С. 229–234.

4. Беларуская міфалогія : Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

5. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І.Я. Лепешаў. – Мінск : БелЭН, 2004. – 448 с.

6. Бирих, А.К. Русская фразеология. Историко-этимологический словарь: ок. 6000 фразеологизмов / СПбГУ; Межкаф. словарный каб. им. Б.А. Ларина; А.К. Бирих, В.М. Мокиенко, Л.И. Степанова ; под ред. В.М. Мокиенко. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Астрель АСТ, Хранитель, 2007. – 926 с.

7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 1. А–В / Рэд. тома М.П. Лобан. – Мінск : Гал. рэд. Бел. Сав. Энцыклапедыі, 1977. – 608 с.

8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 2. Г–К / Рэд. тома А.Я. Баханькоў. – Мінск : Гал. рэд. Бел. Сав. Энцыклапедыі, 1978. – 768 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 17.01.13

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ